УДК 070(091):947.6

В. У. Коваль, асістэнт

# АГУЛЬНЫЯ РЫСЫ РАЗВІЦЦЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ ДЫЯСПАР У XX СТ.

This article is about the wide list of questions, connected with the history of the formation, development and contemporary activity of Ukrainian and Belarusian diaspora. Great attention is paid to the analysis of the development of foreign Ukrainian and Belarusian society, in its connections with the native land and changes of the social structure of emigration. This research dwells upon the role of Ukrainian modern foreign society in the development of economies and cultures of other countries and nations, cultural and political relations. Ii is given the analysis of the new little-known Ukrainian publications and Belarusian emigrant periodicals. The Belarusian diasporan press devoted great attention to Ukrainians.

**Уводзіны.** Тэма гісторыі эміграцыі заўсёды неразрыўна звязана з гісторыяй і культурай метраполіі. Дыяспары, як правіла, намагаюцца захоўваць асноўныя характарыстыкі свайго этнасу, яго культуру, традыцыі і звычаі. Для захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, каб пазбегнуць працэсаў асіміляцыі, эмігранты ў іншакультурным асяродку вымушаны развіваць палітычныя, адукацыйныя і культурныя цэнтры. Гісторыя эміграцыі беларусаў і ўкраінцаў, якія апынуліся па-за межамі былога СССР, мае агульныя рысы, бо прадстаўнікі гэтых двух народаў менавіта за мяжой асабліва востра адчуваюць падабенства ўсходнеславянскіх культур і ментальнасцей.

**Асноўная частка.** Словам «дыяспара» (грэч. *diaspora* – рассяленне) прынята называць сукупнасць пэўнага народа, якая пражывае па-за межамі сваёй дзяржавы. Тэрміны «ўкраінская дыяспара» і «беларуская дыяспара» пачалі актыўна ўжывацца ў навуковых даследаваннях і публіцыстыцы адносна нядаўна, прыблізна адначасова. Можна дакладна ўзгадаць, што першым тэрмін «украінская дыяспара» пачаў выкарыстоўваць у сваіх працах вядомы ўкраінскі палітолаг, этнолаг, сацыолаг В. Старасольскі [1, с. 19]. Дадзены тэрмін «дыяспара» атрымаў сваё распаўсюджванне ў беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі з канца 1980-х гг.

Агульнымі праблемамі для розных дыяспар былі складанасці адаптацыі ў іншых краінах свету. Часта сур'ёзным бар'ерам для беларусаў і ўкраінцаў за мяжой магла стаць замежная мова, бо ў большасці заходніх дзяржаў не было спецыяльных праграм для эмігрантаў, у тым ліку курсаў па вывучэнні мовы. Няведанне мовы краіны значна абмяжоўвала сацыяльны асяродак для прадстаўнікоў новай хвалі эміграцыі. Беларусы і ўкраінцы вымушаны былі шукаць сабе знаёмствы не толькі сярод прадстаўнікоў сваёй дыяспары, але і сярод іншых народаў, мова якіх ім была зразумелай. Блізкасць шматлікіх рэгіянальных дыялектаў беларускай і ўкраінскай мовы дазволіла эмігрантам лёгка ўстанавіць кантакты паміж сабой.

Пры даследаванні гісторыі беларускага і ўкраінскага замежжа можна вызначыць палітычныя і эканамічныя хвалі эміграцыі, якія мелі агульныя рысы для дыяспар двух народаў. Першая масавая хваля эміграцыі мела выключна эканамічны характар, яна пачалася ў канцы XIX ст. і працягвалася да Першай сусветнай вайны. Рэвалюцыі і Першая сусветная вайна выклікалі асобную хвалю палітычнай эміграцыі, краіну пакідалі ўсе тыя, хто быў супраць устанаўлення бальшавіцкай улады. Наступная хваля была выклікана Другой сусветнай вайной. Апошняя хваля эміграцыі ў XX ст. пачалася з 1990-х гг. і працягваецца сёння, асаблівасцю дадзенай хвалі таксама стаў яе эканамічны характар.

Пры даследаванні і параўнаўчым аналізе беларускай і ўкраінскай дыяспар можна адзначыць падабенства сацыяльнага статусу прадстаўнікоў эміграцыйных хваляў у XX ст. Змены сацыяльнага складу беларусаў і ўкраінцаў за мяжой абумоўлены аднымі і тымі ж гістарычнымі падзеямі, такімі як рэвалюцыі, Другая сусветная вайна, распад СССР і г. д.

Падабенства гісторыі матэрыльнай культуры звязана амаль з аднолькавымі прыроднагеаграфічнымі ўмовамі пражывання, асабліва на Палессі, дзе, нягледзячы на афіцыйную мяжу паміж БССР і УССР, згладжваліся энакультурныя рысы беларусаў і ўкраінцаў. У Палесскім рэгіёне на той час традыцыі земляробства, жывёлагадоўлі, кухні, рыбалоўства, пабудовы хат, асаблівасці вопраткі не вылучалі этнічна беларусаў і ўкраінцаў, менавіта таму эмігранты з дадзенага рэгіёна за мяжой лічылі сябе і адучувалі землякамі.

Пасля Першай сусветнай вайны Украіну пакінула частка жыхароў Усходняй Галіччыны, Паўночнай Букавіны, Наддняпроўскай Украіны, Закарпацця, часткова Валыні [2, с. 27]. У першай чвэрці XX ст. за мяжу выехалі ўсе тыя, хто не мог пагадзіцца з канфіскацыяй прыватнай уласнасці і нацыяналізацыяй прамысловасці. Сацыяльны склад беларускай і ўкраінскай эміграцыі дадзенага перыяду падобны: выязжалі белагвардзейцы, святары, прамыслоўцы, земляўласнікі, прадстаўнікі інтэлегенцыі, дзеячы Цэнтральнай Рады, Гетманскай дзяржавы,

Украінскай Народнай Рэспублікі, Заходнеўкраінскай Народнай Рэспублікі, Беларускай Народнай Рэспублікі, Кубанскай Народнай Рэспублікі, украінцы, якія ваявалі на баку Дзянікіна і Врангеля. Сярод эмігрантаў апынуліся фактычна ўсе слаі насельніцтва, але большасць складалі вайскоўцы. Да канца 1920-х гг. былі сфарміраваныя асноўныя культурныя і палітычныя цэнтры беларусаў і ўкраінцаў за мяжой.

Другая сусветная вайна паклала пачатак новай хвалі палітычнай эміграцыі. Разам з немцамі на Захад добраахвотна выехалі прадстаўнікі арганізацый калабарантаў, супрацоўнікі нямецкіх адміністрацый, вайсковых фарміраванняў, якія былі створаны акупантамі. Можна назваць членаў такіх арганізацый, як Саюз беларускай моладзі, Беларуская краёвая абарона, ваенная дывізія СС «Галіччына», Украінская Паўстанская Армія і інш. Сярод эмігрантаў апынуліся беларускія і ўкраінскія остэрбайтэры, у лік якіх трапілі працоўныя і калгаснікі, служачыя і інтэлегенцыя, усе тыя, хто па розных прычынах не захацеў вярнуцца ў СССР. Большасць остэрбайтэраў была ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў, хаця ўгону падлягалі і дзеці. Колькасць беларускіх і ўкраінскіх эмігрантаў таксама папоўнілі ваеннапалонныя, якія баяліся пакарання на радзіме за свой палон.

Пасля распаду Савецкага Саюза і станаўлення незалежных дзяржаў на Захад з Беларусі і Украіны пачалі выязжаць у асноўным маладыя людзі. Для дадзенай хвалі характэрна эміграцыя розных слаёў грамадства па эканамічных прычынах. З канца 1990-х гг. пад удзеяннем унутраных і знешніх прычын масштабы беларускай і ўкраінскай эміграцыі ўзраслі. Неабходна падкрэсліць, што пачала фарміравацца і нелегальная эміграцыя, а гэта значна ўскладняе вывучэнне дадзенай хвалі для гісторыкаў і сацыёлагаў.

Такім чынам, можна падкрэсліць падабенства гісторыі развіцця эміграцыі гэтых двух народаў. Неабходна адзначыць супадзенне эміграцыйных хваляў, іх прычын і характарыстык. На аснове аналізу гісторыі дыяспар можна зрабіць выснову пра падабентва сацыяльнага складу беларускіх і ўкраінскіх эмігрантаў палітычных і эканамічных хваляў у XX ст.

Асноўнымі гістарычнымі крыніцамі пры вывучэнні кантактаў беларускай і ўкраінскай эміграцыі з’яўляюцца перыядычныя выданні беларусаў і ўкраінцаў за мяжой і мемуары эмігрантаў. Пры выкарыстанні дадзеных крыніц даследчыку неабходна праводзіць аналітычную работу па дакладнасці матэрыялаў. З інфармацыі можна вылучыць фактуру, напрыклад, звесткі пра мерапрыемствы, якія былі праведзеныя на эміграцыі. Аднак неабходна мець на ўвазе, што самі эмігранты будуць даваць вельмі суб’ектыўныя адзнакі, зыходзячы са сваіх асабістых палітычных пазіцый, кантактаў, адносін да пэўных асоб і г. д. Большасць мемуараў эмігрантаў выключна станоўча ацэньвае дзейнасць дыяспары, часта завышае значэнне тых ці іншых палітычных і адукацыйных цэнтраў за мяжой, апраўдвае сваё супрацоўніцтва з нямецкай адміністрацыяй у час Другой сусветнай вайны. На старонках прэсы беларускай дыяспары можна знайсці вялікую колькасць матэрыялаў з крытыкай савецкага ладу жыцця, аднак ёсць падставы меркаваць, што агрэсіўны антысаветызм быў палітычнай замовай заходніх разведак пад час «халоднай вайны».

На аснове перыядычных выданняў беларускай дыяспары можна зрабіць выснову, што самымі шчыльнымі і пашыранымі былі стасункі паміж беларусамі і ўкраінцамі за мяжой. Напрыклад, калі прааналізаваць матэрыялы самай папулярнай і распаўсюджанай у Злучаных Штатах газеты «Беларус», можна прыйсці да высновы, што нашмат часцей на старонках выдання друкаваліся матэрыялы пра дзейнасць украінцаў за мяжой, значна менш эмігранты пісалі пра палякаў, літоўцаў і іншыя дыяспары. Пры аналізе разнастайных перыядычных эміграцыйных выданняў перыяду «халоднай вайны» вынік будзе прыблізна такі самы, што сведчыць пра непасрэдны ўплыў украінцаў на беларускую дыяспару.

Неабходна падкрэсліць, што асаблівасці гісторыі ўкраінскай эміграцыі іншыя. Беларусы мелі шмат агульнага з украінцамі за мяжой: падобную ментальнасць народаў, падабенства моваў, агульныя гістарычныя карані, падобную нацыянальную кухню, традыцыі, аднак украінская дыяспара была значна больш моцная і ўплывовая за беларускую. Непараўнальнымі з’яўляюцца таксама і лічбы прадстаўнікоў беларускай і ўкраінскай дыяспар, нягледзячы на іх недакладнасць. Напрыклад, па розных даных сёння па-за межамі гістарычнай радзімы пражывае ад 17 да 20 млн. украінцаў, што складае каля трэці прадстаўнікоў украінскага этнасу [3, с. 3].

Даследчыкі гісторыі ўкраінскай эміграцыі падзяляюць дыяспару на ўсходнюю і заходнюю. Пры даследаванні беларуска-ўкраінскіх кантактаў за мяжой асаблівая ўвага надаецца менавіта заходняй украінскай эміграцыі, якая пачала фарміравацца ў сталую дыяспару з апошняй чвэрці XIX ст. Украінскія гісторыкі пры вывучэнні эміграцыі асаблівую ўвагу надаюць такім краінам, як ЗША, Канада, Германія, Францыя, Велікабрытанія, Італія, Бельгія, Аргенціна, Бразілія, Аўстралія, Польшча, дзе колькасць прадстаўнікоў украінскага этнасу была асабліва значнай. Можна падкрэсліць той факт, што па тэрытарыяльнай прыкмеце беларуская дыяспара фактычна супадае з украінскай.

Значэнне палітычных і эканамічных кантактаў беларусаў і ўкраінцаў за мяжой было розным.

Для беларусаў сувязі, агульныя мерапрыемствы і праекты з украінцамі мелі значна большае значэнне, чым для ўкраінцаў. Менавіта таму беларускамоўная прэса за мяжой намагалася адрэагаваць новымі артыкуламі на ўсе праведзеныя беларуска-ўкраінскія сустрэчы. З іншага боку, украінскія эміграцкія выданні не надавалі вялікага значэння ўдзелу беларусаў. Ступень адзінства ўкраінцаў за межамі краіны, узровень сувязей са сваёй гістарычнай радзімай былі значна вышэйшымі за беларускія.

Беларуская прэса эмігрантаў часта намагалася падкрэсліць зацікаўленнасць украінцаў замежжа беларускай гісторыяй, культурай, літаратурай, палітычнымі падзеямі. Пасля публікацый на старонках перыядычных выданняў украінскай дыяспары на беларускую тэматыку, як правіла, з'яўляліся беларускамоўныя публікацыі кшталту артыкула «Мёртвым не баліць», надрукаванага ў газеце «Беларус». Матэрыял змяшчае інфармацыю пра тое, што ў вядомым украінскім часопісе «Сучаснасць» выйшла ў друк аповесць Васіля Быкава «Мёртвым не баліць» у перакладзе на ўкраінскую мову. Аўтар артыкула пазначае, что твор пісьменніка зрабіў вялікае ўражанне на ўкраінскіх эмігрантаў, менавіта таму пазней украінская газета «Новы Шлях» апублікавала вялікі артыкул Тодара Мацьківа з разгорнутай літаратурнай крытыкай аповесці і выключна высокай адзнакай творчасці В. Быкава. Матэрыял газеты «Беларус» сканчваецца словамі: «…пад уражаньнем украінскае прэсы – да мяне прычапілася дакучлівая думка: мы мусім за ўсякую цану выдаваць беларускі часапіс на ангельскай мове, каб знаёміць Заходні сьвет зь беларускім жыццём у Беларусі й на эміграцыі [4, с. 5]». Можна зрабіць выснову, што матэрыял артыкула яшчэ раз падкрэслівае ўплыў украінскага грамадства за мяжой на беларускую эміграцыю, украінскі прыклад стымуляваў культурную і палітычную дзейнасць беларусаў.

Заходняя ўкраінская дыяспара ў XX ст. практычна не патрабавала механізма абароны нацыянальнага самавызначэння за мяжой. Украінцы намагаліся рознымі сродкамі падтрымліваць сувязь з бацькаўшчынай, нават у складаны перыяд «халоднай вайны». Украінцы шмат энэргіі, сродкаў, часу аддавалі на зберажэнне сваёй ідэнтычнасці ў розных краінах свету.

З мемуараў і прэсы эмігрантаў можна зрабіць выснову, што ўкраінскія эмігранты дапамагалі беларусам, шмат якія культурныя падзеі ўкраінскага жыцця ў розных краінах свету не абыходзіліся без беларусаў. Наогул, можна меркаваць, што беларускія культурныя і адукацыйныя цэнтры бралі прыклад з украінцаў, пераймалі арганізацыйны вопыт, выкарыстоўвалі ідэалагічныя напрацоўкі, звярталіся за парадай. Часта артыкулы беларускамоўнай перыёдыкі з захапленнем распавядалі пра падзеі палітычнага жыцця ўкраінцаў у эміграцыі. Напрыклад, матэрыял «Сусьветны Кангрэс Вольных Украінцаў» распавядае пра ход Кангрэса, які адбыўся 16–19 лістапада 1967 г. у Нью-Йорку з удзелам гасцей з разнастайных дыяспар. Аўтары артыкула пісалі: «Першы Сусьветны Кангрэс Вольных Украінцаў – падзея вялікага нацыянальнага значэньня» [5, с. 7]. Ананімны аўтар выключна станоўча апісвае мерапрыемства, высока ацэньвае палітычную актыўнасць украінскіх эмігрантаў, пазначае, што падчас кангрэса была праведзена вялікая дэманстрацыя, у якую давялося ўмяшацца амерыканскай паліцыі.

Праяўленне этнічнай самасвядомасці ўкраінцаў у культурных вечарынах, палітычных мерапрыемствах, эканамічных праектах часта было прыкладным для беларусаў. У аснове дзейнасці грамадскіх арганізацый украінцаў, палітычных партый і культурных цэнтраў ляжалі прафесійныя, рэлігійныя, творчыя і навуковыя зацікаўленнасці ўкраінскіх асяродкаў. Нацыянальныя традыцыі ўкраінцы старанна захоўвалі ў сваёй пеўчаскай культуры, асаблівасцях украінскай кухні, спосабах правядзення вольнага часу і г. д. Часта ўкраінцы намагаліся аб'ядноўвацца за мяжой у грамадскія і палітычныя арганізацыі менавіта на аснове нацыянальных прыкмет, а беларусы замежжа актыўна пераймалі гэты вопыт.

Наогул, на аснове матэрыялаў перыядычных выданняў беларускай эміграцыі можна зрабіць разгорнуты аповед пра агульныя палітычныя, культурныя і адукацыйныя мерапрыемствы, сустрэчы і юбілеі. Аналіз прэсы дазволіць вылучыць асноўныя накірункі ўплыву дзейнасці ўкраінцаў замежжа.

Вялікая колькасць матэрыялаў прысвечана гісторыі дзейнасці УПА. Зразумела, што Украінскую паўстанскую армію эмігранты ідэалізуюць. Украінскія эмігранты штогод запрашалі беларусаў на святкаванне даты стварэння УПА. Напрыклад, у 1967 г. было праведзена буйное мерапрыемства ў Кліўлендзе, дзе прымалі ўдзел і прадстаўнікі іншых дыяспар, у тым ліку і беларусы [6, с. 6].

У якасці гістарычных крыніц па вывучэнні беларуска-ўкраінскіх культурных сувязей можна плённа выкарыстоўваць і ўкраінскія перыядычныя выданні дыяспары. Неабходна падкрэсліць, што гісторыя развіцця прэсы ўкраінскіх эмігрантаў пачалася значна раней. Колькасць газет і часопісаў замежжа на ўкраінскай мове значна большая за колькасць беларускіх перыядычных выданняў, што абумоўлена высокай актыўнасцю украінцаў і значным лічбавым складам украінскай дыяспары. Напрыклад, адразу пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ў Злучаных Штатах выходзілі з друку 29 газет і часопісаў, а ў 1958 г. іх налічвалася ўжо 79,

у 1963 г. – больш за 300 [7, с. 429]. Самымі вядомымі і распаўсюджанымі ўкраінскімі перыядычнымі выданнямі замежжа можна лічыць такія газеты і часопісы, як «Свобода», «Америка», «Українські вісті», «Українське життя», «Канадський фермер», «Український голос», «Мета», «Шлях перемоги» і інш.

Пры вывучэнні беларуска-ўкраінскіх кантактаў можна выкарыстаць мемуары эмігрантаў. Адным з актыўных дзеячаў беларускай дыяспары з'яўляецца Вітаўт Кіпель. Даследчык сам прадстаўляе свае кнігі як навуковыя выданні, аднак дадзенае пытанне даволі спрэчнае. Часта аўтар кіруецца пачуццямі і ўласнымі перакананнямі, а не афіцыйнымі дакументамі, таму работы аўтара варта аднесці да публіцыстыкі.

Між іншым, на аснове матэрыяла В. Кіпеля можна зрабіць выснову пра шчыльныя кантакты беларусаў і ўкраінцаў. Напрыклад, ёсць звесткі пра агульныя эканамічныя праекты прадстаўнікоў першай хвалі эміграцыі ў XX ст. Аўтар піша: «Першая супольная беларуска-ўкраінская страхавая арганізацыя была заснаваная ў Мічыгане ў 1913 годзе, яе статут быў надрукаваны ў 1914 годзе. Гэтая арганізацыя была закладзеная беларусамі і ўкраінцамі й прымала ў сябры прадстаўнікоў гэтых двух народаў [8, с. 85]». Неабходна заўважыць, што беларускія эмігранты часта пісалі пра агульныя эканамічныя праекты. Можна выказаць меркаванне, што больш моцная ў эканамічным плане, больш аб'яднаная ўкраінская дыяспара аказвала матэрыяльную дапамогу беларусам за мяжой.

У сваёй кнізе «Беларусы ў ЗША» Вітаўт Кіпель неаднаразова спасылаецца на ўкраінскіх эмігрантаў, ён дакладна піша пра іх пазітыўнае стаўленне да беларусаў: «Бяспрэчна, украінцы і ўкраінская грамада ў Амэрыцы былі першымі, хто прызнаў палітычныя памкненьні беларусаў, азнаёміў з гэтымі памкненьнямі шырокія масы ў Злучаных Штатах, шмат паспрыяўшы тым самым беларускаму й культуранаму адраджэньню [8, с. 276]». Мемуары В. Кіпеля не адзіныя, можна вывучаць таксама ўспаміны Я. Запрудніка, К. Мерляка, Б. Рагулі, Л. Геніюш, украінскіх эмігрантаў і г. д. Аднак пры выкарыстанні ўспамінаў эмігрантаў у якасці гістарычных крыніц даследчыку неабходна памятаць пра суб'ектыўныя адносіны аўтараў да падзеяў у Савецкім Саюзе, пэўных палітычных арганізацый і асоб, менавіта таму мемуары неабходна ўсебакова аналізаваць і даследаваць.

**Заключэнне.** На палітычную, культурную і эканамічную актыўнасць беларускай эміграцыі вялікі ўплыў аказвала дзейнасць іншых дыяспар. Гісторыя беларускай і ўкраінскай эміграцыі мела шэраг агульных рысаў: супадалі перыяды фарміравання эміграцыйных хваляў, прычыны, якія іх выклікалі, змены сацыяльнага складу грамадства замежжа, палітычныя перакананні і погляды, стаўленне да падзеяў у СССР. Важна адзначыць, што для прадстаўнікоў беларускай эміграцыі падтрымка і дапамога ўкраінскай дыяспары мела вялікае значэнне. Украінцы стымулявалі актыўнасць, дапамагалі кансалідацыі беларусаў замежжа, паказвалі прыклад, уключалі ў свае культурныя, адукацыйныя, палітычныя мерапрыемствы.

## Літаратура


1. Трощинський, В. П. Українці в світі / В. П. Трощинський, А. А. Шевченко. – Київ: Альтернативи, 1999. – 352 с.
2. Лазебник, С. Закордонне українство: витоки та сьогодення / С. Лазебник. – Київ: Істина, 2007. – 160 с.
3. Бабута, М. Н. Формирование и современное состояние украинской диаспоры (конец XIX – начало XX вв.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.07 / М. Н. Бабута; Томский государственный университет. – Томск, 2008. – 26 с.
4. Ж. Мёртвым не баліць / Ж. // Беларус. – 1967. – № 117. – 8 с.
5. Сусьветны кангрэс вольных украінцаў // Беларус. –1967. – № 128. – 8 с.
6. С. К. На ўкраінскім сьвяце / С. К. // Беларус. – 1967. – № 127. – 8 с.
7. Макарчук, С. А. Етнічна історія України / С. А. Макарчук. – Київ: Знання, 2008. – 471 с.
8. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск: Беларусь, 1993. – 352 с.